# Каля нарачанскіх сосен – яго радасці і думы

**Шмат у якіх прэзентацыях кніг даводзілася мне прымаць удзел. Дзе толькі яны ні ладзіліся. Само сабой зразумела – у Доме літаратара, у розных кнігарнях. У савецкі час падобныя мерапрыемствы арганізоўваліся таксама на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах. А яшчэ, вядома, у школах, бібліятэках, Дамах культуры… Аднак прадстаўленне шырокай грамадскасці кнігі народнага паэта Беларусі Максіма Танка «Нарочанские сосны», што адбылося ў красавіку 1978 года, несумненна, аказалася па-за межамі агульнапрынятых канонаў. Нічога падобнага дагэтуль не было. Дый наўрад калі-небудзь будзе.**

У той час напярэдадні чарговай гадавіны нараджэння У. Леніна практыкавалася правядзенне камуністычных суботнікаў. Не заставаліся ўбаку ад іх і работнікі культуры, дзеячы мастацтва. Пісьменнікі і супрацоўнікі літаратурна-мастацкіх выданняў традыцыйна такія святы працы ладзілі ў тагачасным Доме творчасці пісьменнікаў імя Якуба Коласа, што знаходзіўся ў Каралішчавічах непадалёку Мінска. Не стаў выключэннем і 1978 год.

На тым суботніку былі ўсе роўныя: і масцітыя майстры, і творчая моладзь. Аднак у цэнтры ўвагі неўзабаве аказаўся Максім Танк. Калі Яўген Іванавіч толькі з'явіўся ў Каралішчавічах, а прыехаў ён асобна, па яго радасным твары ўсе здагадаліся: усё ў парадку. Справа ў тым, што ягоная кніга «Нарочанские сосны» ў перакладзе Якава Хелемскага, якая годам раней пабачыла свет ва ўсесаюзным выдавецтве «Художественная литература», была вылучана на атрыманне Ленінскай прэміі. Аднак, хоць і хадзілі ўжо чуткі, што кандыдатура М. Танка прайшла, афіцыйнага паведамлення пакуль не было. Аказваецца, яно нарэшце з'явілася.

Усе кінуліся віншаваць Яўгена Іванавіча з высокай дзяржаўнай узнагародай. Віншавалі шчыра, ад душы. Радаваліся не менш, чым сам віноўнік урачыстасці. Бо вельмі любілі яго творчасць. Любілі і самога М. Танка. Любілі і паважалі.

Усяго адзін прыклад, але такі, што больш чым красамоўны. У 1971–1990 гадах Яўген Іванавіч працаваў старшынёй праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, а да гэтага пяць гадоў быў першым сакратаром праўлення. Пасады гэтыя былі выбарныя. Сама ж працэдура выглядала наступным чынам. Спачатку закрытым галасаваннем выбіралі праўленне, а ўжо яно вызначалася са старшынёй. Дык Яўген Іванавіч нязменна набіраў рэкордную колькасць галасоў. За ім з малым адрывам заўсёды ішоў Іван Шамякін. Два волаты нацыянальнага прыгожага пісьменства. І абодва сумленнейшыя, душэўна чыстыя і спагадлівыя людзі. Таму і карысталіся яны такім вялікім аўтарытэтам.

Дык вось: на тым суботніку віншаванне М. Танка з прысуджэннем яму Ленінскай прэмііператварылася і як бы ў своеасаблівую прэзентацыю ягонай кнігі «Нарочанские сосны». Паколькі ж адбывалася ўсё ў незвычайных умовах, то і праходзіла зусім па-іншаму, чым тады, калі бывае дзе-небудзь на сустрэчы з чытачамі.

Спачатку быў вялікі касцёр. Валіліся ў вялізную кучу дрэвы-сухастоі, збіралася леташняя трава – і вось ужо маленькі агеньчык лёгка пабег па галінках, іскрамі-пырскамі вырваўся ўверх, прагавіта паядаючы сучча, а затым перакінуўся і на тоўстыя камлі дрэў, загадзя прыцягнутыя з ляснога гушчару.

Касцёр гэты шмат у чым быў звычайны. Аднак у той жа час і непадобны на іншыя. Многімі з прысутных ён успрымаўся сімвалічным кастром паэзіі, якая гэтаксама здатна дарыць сваё цяпло людзям, абуджаючы светлыя думкі і памкненні, выклікаючы на шчырасць і адкрытасць.

Да позняга вечара гучалі вершы, чуліся жарты. Прачытаў некалькі вершаў і Яўген Іванавіч. Аднак больш маўчаў. Разам з іншымі думна глядзеў у полымя кастра. Назіраючы за ім збоку, можна было здагадацца, што ў гэтыя хвіліны яго міжвольна апаноўваюць думкі аб перажытым. Многае

ўспаміналася, занава ажываючы ў памяці. Бадай, тады знайшлося ў ёй месца і такім радкам:

*Я і сёння распаліў касцёр начлежны*
*І гляджу, як скача полымя жывое*
*Басаногаю цыганкаю гарэзнай,*
*Бубен месяца падняўшы над сабою.*

Безумоўна, думкі вярталі паэта да хаты, неслі яго на сваёй плыні туды, дзе шумна плешчацца Нарач, а ў вершалінах стройных соснаў гуляе вецер, казычучы іх сваімі нябачнымі пальцамі.

Нарачанскія сосны заўсёды былі танкаўскай любоўю і пяшчотай, ягоным болем і трывогай. А таксама – памяць. Вечная памяць аб тым, што ніколі не забываецца: «Я часта начую і днюю ля сосен сваіх нарачанскіх, дзе ўсе беды мае, дзе ўсе радасці мае, дзе ўсе думы мае».

Не, не выпадкова назваў ён гэтую кнігу менавіта так – «Нарочанские сосны». Проста не мог інакш назваць. Дый не хацеў. Прадчуваў, мабыць, што яна стала вяршыняй ягонай творчасці. Ва ўсякім разе, для чытача рускамоўнага, які не меў магчымасці знаёміцца з усімі папярэднімі ягонымі кнігамі ў арыгінале. З вяршыні ж далёка бачыцца наперад. Што б ужо ні было здзейснена ў далейшым, так ці іначай захочацца вярнуцца і назад, каб паглядзець на сваю новую работу. Гэтак і на зямлю бацькоў прыходзіць чалавек звычайна тады, калі ў нейкія моманты свайго жыцця хоча цвярдзей адчуць родную глебу пад нагамі. Тую родную глебу, што назаўсёды захавала цяпло ягонага басаногага дзяцінства.

## ШЫРМА НЕ ПАМЫЛІЎСЯ

Супадзенне – з тых, што трапляюць пад вызначэнне «яго вялікасць выпадак». Нарадзіўся Максім Танк (Яўген Іванавіч Скурко) 17 верасня 1912 года. Таксама 17 верасня, але ў 1939 годзе, як вядома, Заходняя Беларусь была ўз'яднана з Беларуссю Усходняй, а дакладней – увайшла ў склад БССР.



Максім Танк

Менавіта ён, Яўген Скурко, знаходзіўся ў шэрагу тых змагароў за сацыяльнае і нацыянальнае разняволенне, якія набліжалі гэты святочна-радасны дзень. Менавіта ён, Максім Танк, вядомы заходнебеларускі паэт, сваёй творчасцю спрыяў яднанню беларускага народа ў адзінай савецкай сям'і.

Яму давялося вучыцца ў чатырох гімназіях – Радашкавіцкай і Віленскай беларускіх, а таксама ў Вілейскай і Віленскай – рускіх. Аднак атэстата аб сярэдняй адукацыі ўсё адно так і не атрымаў: выключалі то за школьныя забастоўкі, то за ўдзел у розных выступленнях супраць улады, а таксама за пратэст, які выказваў тады, калі ўлады ліквідоўвалі беларускія ўстановы.

Ягонае першае баявое хрышчэнне адбылося яшчэ ў 1930 годзе, калі вёз нелегальную камуністычную літаратуру ў аўтобусе. Рызыкнуў ехаць разам з паліцэйскімі. Дзейнічаў па прынцыпе, што тыя ні ў якім разе нічога не западозраць.

Упершыню быў арыштаваны ў сакавіку 1932 года. Абвінавачанне сур'ёзнае: супрацоўніцтва з камуністычным друкам. Але тым разам усё абышлося.

Зноў арыштавалі ў маі 1933-га, калі М. Танк, тады інструктар ЦК камсамола Заходняй Беларусі, праводзіў падпольную работу сярод моладзі. Прысуд быў суровы – шэсць гадоў. Праўда, апеляцыйны суд даў два гады ўмоўна і пазбавіў на восем гадоў грамадзянскіх правоў. Але юнак не зламаўся, пачаў выдаваць часопіс «Краты», у якім змяшчаліся вершы, публіцыстыка. Не толькі на беларускай мове, а і на ўсіх тых, на якіх размаўлялі асуджаныя. Сярод жа іх быў поўны «інтэрнацыянал».

Верасень 1934-га – новы арышт. Выратавала тое, што вершы свае пісаў друкаванымі літарамі, таму ягонае аўтарства экспертызай не было ўстаноўлена.

Пачатак верасня 1937 года – суд за выданне кнігі вершаў «На этапах», першага ягонага паэтычнага зборніка.

Аднак актыўная рэвалюцыйная дзейнасць не перашкаджала яму захапляцца

літаратурай. Асабліва вабіла беларуская паэзія. Любіў творчасць Янкі Купалы, Якуба Коласа. З задавальненнем слухаў ад нарачанскіх рыбакоў легенды і паданні. Адна з гэтых легендаў – аб Шкленікаўскім возеры – настолькі ўсхвалявала Жэню, што сам узяўся за пяро.

Вясной 1932 года ўпершыню змясціў свае вершы ў часопісе «Пралом», які ўзяўся выпускаць разам з гэткім жа маладым, як і сам, паэтам, а да ўсяго мастаком Янкам Гарохам. Праўда, імпэту хапіла ўсяго на два нумары. Дый памочнік пасля першага нумара пакінуў Вільню.

Першы нумар «Пралома» быў перапісаны ад рукі, таму выйшаў усяго ў двух экзэмплярах. Затое другі ўдалося аддрукаваць на гектографе. Адпаведна і тыраж прыстойны – пяцьсот экзэмпляраў. Жаданне быць цвёрдым і нязломным у барацьбе за свабоду роднага народа падказала зусім юнаму яшчэ паэту адзін з першых ягоных псеўданімаў – Граніт.

Некаторыя творы з гэтага часопіса ўвайшлі ў «Хрэстаматыю літаратуры Заходняй Беларусі», што выйшла ў Мінску ў 1933 годзе. Быў змешчаны ў ёй і верш «Заштрайкавалі гіганты коміны», які ў газеце-аднадзёнцы «На пераломе» (выйшла ў Львове ў 1932 годзе) Я. Скурко ўпершыню падпісаў псеўданімам Максім Танк. З гэтага часу ён і стаў галоўным літаратурным прозвішчам паэта.

Праз чатыры гады выйшла першая кніга М. Танка «На этапах». Гісторыя з'яўлення яе цікавая і павучальная. З аднаго боку, яна добра сведчыць пра тое, з якой цяжкасцю прабівалася заходнебеларуская літаратура да свайго чытача, з другога – пра тое, што кампартыя прыкладала немалыя намаганні для таго, каб паэтычнае слова знаходзіла водгук у сэрцы народа.

М. Танк неяк прачытаў свае вершы Рыгору Шырме, з якім яго звязвала падпольная работа. Рыгор Раманавіч прапанаваў выдаць зборнік маладога паэта. Гэтая прапанова зацікавіла і кіраўніцтва партыі. Была выдзелена неабходная сума грошай. Р. Шырма напісаў прадмову, і кнігу аддрукавалі. Праўда, ужо на другі дзень пасля выхаду зборнік быў канфіскаваны. Уратаваць удалося толькі невялікую частку тыражу. Два асобнікі М. Танк паслаў Янку Купалу і Якубу Коласу на адрас Акадэміі навук БССР. І, як даведаўся пазней, народныя песняры не толькі атрымалі гэты сціплы падарунак маладога паэта, але былі высокай думкі аб творах, змешчаных у першым зборніку.

Рыгор Шырма быў упэўнены, што на заходнебеларускім небасхіле талент маладога паэта «адразу загарэўся зоркай першай велічыні». «Думаецца, – сведчыў Рыгор Раманавіч, – што нам яшчэ прыйдзецца быць сведкамі таго, як яго талент падымецца да Вялікага Сузор'я – Купалы-Коласа». Празорцам аказаўся Р. Шырма.



Хата, у якой жылі бацькі паэта

## ШТО ЦУДОЎНА, ТОЕ ЦУДОЎНА

Заклікам да барацьбы, да змагання, верай у шчаслівы дзень былі напоўнены вершы М. Танка заходнебеларускай пары. Ён пісаў аб тым, што глыбока перажыў сам і ў што верыў. М. Танк адначасова з'яўляўся і паэтам, і публіцыстам, і агітатарам, і воінамрэвалюцыянерам. Аднак гэта быў не проста рэвалюцыянер, а рэвалюцыянер менавіта беларускі. Таму для ягонага лірычнага героя, поруч з іншымі пытаннямі, востра стаяла і пытанне захавання роднай мовы. Аб гэтым, прынамсі, сведчыць напісаны ў 1931 годзе верш «Калі няма на свеце маёй мовы...».

Эпіграфам да яго малады паэт узяў вытрымку з публікацыі адной тагачаснай рэакцыйнай газеты: «Няма ніякіх беларусаў

і іх мовы». Яго, як і тых, хто змагаўся і за тое, каб жыло роднае слова, працавалі на беларускай мове школы, выходзілі кнігі, такое сцверджанне не магло не абурыць. Гэты твор прасякнуты гнеўна-выкрывальным пафасам. Галасы лірычнага героя і самога паэта гучаць суладна, ператвараючыся ў адно цэлае:

*Калі няма на свеце маёй мовы,*
*Майго народа і мяне самога, –*
*Дык для каго будуеце, панове,*
*Канцлагеры, катоўні і астрогі?*
*Супроць каго рыхтуеце распраўы*
*І шыбеніцы ўзносіце пад хмары,*
*Штодня арганізуеце аблавы*
*І ўсіх мабілізуеце жандараў?*
*Супроць каго рыхтуеце вы змовы*
*З прадажнымі і юдамі і з Богам, –*
*Калі няма на свеце маёй мовы,*
*Майго народа і мяне самога!*

Як тут не ўспомніць куды пазнейшы верш М. Танка «Калі трэба была песня», што ўвайшоў у ягоную кнігу «Дарога, закалыханая жытам» (1976):

*Калі трэба была песня –*
*Ні ў чые не грукаў дзверы.*
*А яе знаходзіў дома,*
*Як пад лаваю сякеру,*
*Як у прыпечку – цяпельца,*
*У сальніцы – жменю солі,*
*На дрывотні – кій дарожны,*
*Жаўрука – на родным полі.*

Іншыя даваенныя кнігі М. Танка: «Журавінавы цвет» (1937), «Пад мачтай» (1938), паэма «Нарач» (1937) пацвердзілі, наколькі ў іх аўтара жыццядайны талент. Засведчылі таксама, як клопатна ставіцца ён да ўсяго таго, што патрапляе пад вызначэнне «Беларусь», «беларускае», «беларускасць». Любіць усё гэта ён не заклікаў. Паэт зместам саміх твораў пераконваў: нельга не любіць усё гэта, калі яно тваё. І як мага аддаваць яго іншым.

Не ведаю, ці вывучаецца сёння ў школьнай праграме танкаўскі верш «На пероне». Мы ж, каму сёння падбіраецца пад семдзесят, вучылі яго. Без асаблівай прынукі завучвалі на памяць, бо надта кранальныя радкі ў творы:




У час першага арышту. 1932 год




Вокладка першай кнігі паэзіі «На этапах». 1936 год

*Гудкі і калёс перазвон, –*
*Памалу цягнік пад'язджае.*
*Абмыла вячэрні перон*
*І песня, і мова чужая.*

*І ўсё іх дзівіла у нас:*
*І беднасць зямлі,*
*І багацце,*
*Палёў хараство,*
*І вясна,*
*І нашы лазовыя лапці.*

*....................................*

*На захад ідуць цягнікі –*
*Лён,*
*Жыта,*
*Сасна і бяроза...*

*Гляджу і гляджу з-пад рукі,*
*Як наша юнацтва вывозяць.*

А ўзяць паэму «Нарач»! Яе смела можна аднесці да вяршынь даверасне́ўскай творчасці М. Танка. У аснову твора пакладзены падзеі, што мелі месца ў сапраўднасці – паўстанне рыбакоў-сялян на возеры Нарач. Але паэма не толькі пра гэты супрацiў. Яна – зноў жа! – пра Беларусь і беларусаў. Яна пра вялікую, усёперамагальную сілу народнага духу.

Каб перадаць усё гэта ярка, аб'ёмна – мала нейкага аднаго жанру. У межах яго і самому аўтару, дый чытачу таксама проста будзе цесна. Таму М. Танк, па-майстэрску звёўшы ў адзінае цэлае і лірыку, і драму,

і эпас, пачаў з маналога-споведзі, які гучыць нібыта песня і адразу настройвае на своеасаблівы лад успрыняцця таго, пра што ў далейшым пойдзе гаворка.

*Люблю твае, Нарач, затокі і тоні,*
*Як вецер густыя туманы развесіць.*
*Ці снежная пена на хвалях зазвоніць,*
*Цалуючы зоры, калышучы месяц.*

..................................................

*Люблю твае буры, твае навальніцы.*
*Ў іх чую, бы ў песнях, жыццё маладое.*
*І хочацца блізка грудзьмі прытуліцца*
*Да чорных ад гневу кіпучых прыбояў.*

Не памятаю ўжо хто... здаецца, Мікола Арочка, аналізуючы паэму «Нарач», правёў паралель з такімі шырока вядомымі радкамі, як «Мой родны кут, як ты мне мілы!» Якуба Коласа, «Люблю мой край, старонку гэту» Канстанцыі Буйло. Сапраўды, яны вартыя таго, каб быць заўсёды на слыху. Бо гэта тое, для ацэнкі чаго дастаткова аднаго слова: цудоўна!

## КАБ РАСКУТАЯ ПЕСНЯ НЕ ПЛАКАЛА

Паэзія М. Танка заўсёды была народнай. Мудрая і простая, шчырая і светлая, мужная і стойкая, роздумная і на дзіва філасафічная, яна радавала шматлікія чытацкія сэрцы і паланіла іхнія душы. Запрашала кожнага, хто знаёміўся з ягонымі творамі, да ўнутранага дыялога. Танкаўская паэзія вяла ў той непаўторны свет цудоўнага, першароднага, дзе заўсёды асабліва хораша і чыста дыхаецца, таму што там усё роднае, блізкае, дарагое. Асабліва цікава і немалаважна: М. Танк, які прайшоў праз агонь барацьбы, назаўсёды захаваў у сваім сэрцы шчырасць і ўменне суперажываць іншым.

Паэт-барацьбіт, трыбун і публіцыст – ён быў і заставаўся на пярэднім краі жыцця. Дый біяграфія ягоная – па сутнасці біяграфія народа, які прайшоў праз гора і радасць, шчасце і барацьбу. М. Танк не шукаў лёгкіх шляхоў і не імкнуўся ўпрыгожыць паэтычнае слова моўнай мудрагелістасцю. Наадварот, заўсёды стараўся расказаць аб тым, што яго найбольш хвалявала, прымушала неспакойна біцца сэрца.



Паэт з жонкай Любоўю Андрэеўнай. 1938 год

Так было ў Пількаўшчыне ў верасні 1939 года (тады ён акурат знаходзіўся ў бацькоў), калі прыбеглі хлопцы з суседняй вёскі і радасна паведамілі, што Чырвоная армія перайшла граніцу, каб вызваліць Заходнюю Беларусь. У яго адразу ж напісаўся верш-вітанне «Здарова, таварышы!». Колькі радасці за тое, што адбылося, гучыць у паэтычных радках! Колькі ўпэўненасці ў новым, шчаслівым жыцці! Ён не хібіў душой, не маніў сэрцам, калі пісаў усё гэта. Ён гэтым жыў, як і жылі ўсе тыя, хто па-сапраўднаму любіў сваю краіну, свой народ:

*Раскутая песня не будзе больш*
*плакаць,*
*Вясна – на чырвоным куце за*
*сталом.*
*Ад сэрца народнага шчырае*
*дзякуй*
*Братам і сцягам*
*палымнеючым шлём.*

Гэта не проста пісалася. Прамаўлялася тое, чым жыла душа, чым хацелася падзяліцца з іншымі. Давала пра сябе знаць выпакутаванае права на падобную споведзь.

Так было і ў гады Вялікай Айчыннай вайны, калі М. Танк разам з усім народам верыў у перамогу, набліжаючы яе пяром журналіста, працуючы ў франтавым і партызанскім друку. Крылатымі сталі радкі паэта:

*Не шкадуйце, хлопцы, пораху,*
*Куль гарачых і гранатаў.*
*Ўсе, каму свабода дорага,*
*Падымайцеся на ворагаў,*
*На катаў!*

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, ён з цяжкасцю выбраўся з Беластока, дзе тады знаходзіўся, і далучыўся да беларускіх пісьменнікаў, якія рухаліся на ўсход. Потым разам з іншымі выпускаў газету «За Савец-

кую Беларусь» (Бранскі фронт), агітплакат «Раздавім фашысцкую гадзіну», прымаў удзел у антыфашысцкіх мітынгах, выступленнях.

У 1943 годзе напісаў паэму «Янук Сяліба», якая не толькі займае значнае месца ў ягонай творчасці, а і прыкметная тым, што гэта адзін з першых буйных паэтычных твораў у беларускай літаратуры перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Больш за тое, унутрана гэта паэма пераклікаецца з паэмай «Нарач». Найперш у тых месцах, дзе гучыць тэма прывязанасці да родных мясцін. Да месца ўведзены ў сюжэтную канву і матывы вусна-паэтычнай творчасці. Прынамсі, легенда пра музыканта Куліка – сведчанне невычэрпнасці і моцы народных духоўных асноў.



Бацькі М. Танка Домна і Іван Скурко

## ІМПЕРЫЯ, У ЯКОЙ НІКОЛІ НЕ ЗАХОДЗІЛА СОНЦА

Пасляваенны час пацвердзіў: М. Танк – паэт яркай творчай індывідуальнасці. Пэўная тэматычная «вузкасць» яго твораў заходнебеларускага перыяду была толькі вынікам тых умоў, у якіх развівалася ягоная паэзія, калі не было розніцы паміж літаратурай і заклікам. М. Танк усё больш імкнуўся ў сваёй творчасці ахапіць шматграннасць жыцця, паказаць яго ва ўсёй філасофскай складанасці, галоўную ўвагу ўдзяляючы простаму чалавеку – учарашняму воіну, сённяшняму мірнаму працаўніку.

Яшчэ больш шырокае прызнанне да яго прыйшло пасля таго, як кніга «Каб ведалі» ў 1948 годзе была адзначана Дзяржаўнай прэміяй СССР. Своеасаблівай запеўкай гучаў аднайменны верш:

*Расце на высокім кургане сасна,*
*Каб ведалі,*
*Дол апляла каранямі да дна,*
*Каб ведалі;*
*Вяршыняю зоры кранае яна,*
*Каб ведалі;*
*З ветрам звініць, як тугая струна,*
*Каб ведалі*
*Маткі,*
*Дзе спяць дзеці-сокалы сном;*
*Вятры,*
*Дзе іграць галасістым смыком;*
*Зоры,*
*Дзе ім асыпацца дажджом;*
*Птушкі у выраі —*
*Родны свой дом.*

Поспех акрыліў. Зноў голас паэта гучаў радасна і свежа. М. Танк услаўляў мірныя будні, не забываючы згадаць тых, хто загінуў за свабоду Радзімы. Ён звяртаўся да вечнай тэмы кахання, пісаў аб вялікай адказнасці перад Радзімай. Як пісаў і аб адказнасці перад партыяй. Пісаў, таму што менавіта так думаў. А думаў так, бо гэтымі высокімі ідэаламі, як ужо адзначалася, жыў з маладых гадоў. Ён верыў, як верыць сумленны чалавек таму, да чаго ляжыць ягоная душа, што ўспрымае важнай часткай свайго жыцця. Калі ж верыў, то і пісаў ад чыстага сэрца:

*Толькі я хацеў бы скласці песню,*
*На якой бы у маім райкоме*
*Напісалі дарагія словы:*
*«Прачытай і перадай другому!»*

Што ж, словы гэтыя смела можна пазначыць на кнізе «След бліскавіцы», за якую М. Танк быў удастоены Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы (1959), і на зборніку «Мой хлеб надзённы» – ён адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР (1978). Не кажучы ўжо пра «Нарочанские сосны». Дый на іншых кнігах можна ставіць згаданыя словы, а выдаваўся ён шмат. Апроч названых кніг, нельга не згадаць «Прайсці праз вернасць» (1979), «За маім сталом» (1984), «Збор калосся» (1989),

«Мой каўчэг» (1994), «Errata» (1996)... Сюды трэба дадаць неаднаразовыя перавыданні, зборы твораў, а таксама шматлікія кнігі для дзяцей. Нельга не адзначыць і ягоную плённую перакладчыцкую і літаратурна-крытычную дзейнасць, дзённікавыя нататкі «Лісткі календара».

Перш-наперш ён заставаўся Паэтам, аднолькава ўпэўнена адчуваючы сябе ў класічным памеры і верлібры. Гэтаксама з нязменным майстэрствам пісаў вершы і паэмы, балады і казкі. Іначай пісаць проста не мог. Талент не дазваляў. А яшчэ тая высокая адказнасць за слова, што выпрацавалася гадамі. І агромністы запас творчай энергіі, які не дазваляў адкладваць пяро ўбок.

У пацвярджэнне такой думкі дастаткова прывесці верш «На экзамене», які, пры ўсёй ягонай афарыстычнай напоўненасці, выяўляе сутнасць Танка-паэта:

*У мяне спыталі:*
*– У якой імперыі*
*Не заходзіла сонца?*
*Я адказаў: – Толькі ў адной –*
*У імперыі паэзіі...*

*І праваліў экзамен,*
*Па гісторыі.*

Затое, развіваючы гэтую думку, можна сказаць пэўна: па літаратуры экзамен М. Танк «не праваліў бы» ніколі. Яе ведаў як свае пяць пальцаў, бо шмат якія найбольш значныя старонкі былі напісаны непасрэдна ім самім. Сярод ягоных твораў і сапраўдны паэтычны шэдэўр – верш «Ave Maria». Невыпадкова вядомы літаратуразнавец Алег Лойка ў свой час яго разгляду прысвяціў асобны артыкул. Што ж, ёсць над чым паразважаць. Як і ёсць над чым задумацца. І не толькі над жаночым лёсам, а і над тым, якая гэта вялікая сіла – сапраўдная паэзія. Асабліва калі стваральнікамі яе, а значыць, і носьбітамі з'яўляюцца такія маштабныя творчыя індывідуальнасці, як М. Танк.

Таму ў ягонай паэтычнай імперыі сонца ніколі і не заходзіла. Да ўсяго цягам часу свяціла не менш ярка, а то і зырчэй, чым у пару творчай маладосці. Пры гэтым творчае натхненне ніколі не пакідала Яўгена Іванавіча.

## ШТО НІ ВЕРАСЕНЬ – НОВЫЯ ТВОРЫ

На працягу добрага дзясятка гадоў пастаянныя чытачы часопіса «Полымя» штогод з нецярпеннем чакалі дзявяты нумар. Змаглі ўпэўніцца ўжо, што ён абавязкова адкрыецца новай падборкай твораў іх любімага паэта. Бывалі гады, калі іх набіралася ці не на ладны паэтычны зборнік. Гэтак М. Танк адзначаў свой чарговы дзень нараджэння. У нязменнай рабочай форме, з поўнай, пармейску кажучы, выкладкай. І, як звычайна, не абыходзячы ў жыцці самых вострых момантаў сучаснасці.

Больш за тое, шмат што з той рэчаіснасці, сведкам якой ён стаў на схіле сваіх гадоў, не толькі непакоіла яго, а і гняло, выклікала далёка не радасны настрой. Не-не, ды ўзнікалі думкі: а ці дзеля таго змагаўся, ідучы на палітычныя барыкады? Цяжка станавілася на душы, калі бачыў, як рвуцца да ўлады тыя, каго нельга да яе падпускаць і на гарматны стрэл. Млосна было, калі заўважаў, як



Сярод сяброў і землякоў

узводзяць на п'едэстал звычайную шэрасць і пасрэднасць. У тым ліку гатовы рабіць ледзь не класікамі тых, каго ён добра ведаў па сваёй заходнебеларускай маладосці і якія нічым асабліва не вызначаліся. Часам проста прыстасоўваліся там, дзе з гэтага можна было мець нейкі выйгрыш. Аднак больш за ўсё балюча было М. Танку з-за ўсведамлення таго, што знішчаліся ідэалы, за якія змагаўся сам і за трыумф якіх памерлі многія ягоныя сябры.

Пра гэта таксама хацелася пісаць. Пра гэта не мог не пісаць. У прыватнасці, з'явіўся верш «Не вязе мне, спадары, прызнацца» – адзін з шэрагу тых твораў, у якіх яго, танкаўскай, адкрытай душы нясцерпна балюча:

*Не вязе мне, спадары, прызнацца.*
*Паспяшыў калісьці нарадзіцца,*
*Не навучыўся бізнесам займацца*
*І не ўцёк у свой час за граніцу.*

*Сёння мо хадзіў бы ў патрыётах,*
*Геніяльных бардах-адраджэнцах*
*І ніякіх бы не знаў турботаў*
*І ніякай арытміі сэрца.*

*А то ўзяўся ратаваць Еўропу*
*Ад няволі, цемрашальства, злобы...*
*Дзесьці спяць мае сябры ў акопах.*
*Дай і мне, Бог, легчы з імі побач.*

Глыбінны сэнс закладзены ў вершы «Зямля». Ён як бы пераклікаецца з тым, з гадоў маладосці, вершам «На пероне», пра які ўжо ішла гаворка. Канечне, думка ў новым творы набыла яшчэ больш глыбокі сэнс. У чымсьці нават канкрэтызавалася, стала выразнікам ягонай грамадзянскай пазіцыі:

*Ёсць звычай спаконвечны*
*ў афрыканцаў:*
*Калі госць ад'язджае, яго просяць*
*Разуцца і з абутку пыл зямны атрэсці,*
*Бо гэта — іх найдаражэйшы скарб.*
*Тут могуць вам падараваць на памяць*
*Алмазы, золата ці сланоў біўні,*
*Але зямля, у якой ляжаць бацькі іх,*
*А некалі і ім прытулак дасць, –*
*Не дорыцца нікому і не прадаецца.*

Дый настальгія па тым, што незваротна мінулася, гэта не толькі звычайны стан для чалавека сталага ўзросту. Гэта, да ўсяго, і прага душэўнага ачышчэння, якое па-сапраўднаму магчыма толькі тады, калі знаходзіш належнае маральнае і духоўнае апірышча (верш «Калі ўжо не змагу»):

*Калі ўжо не змагу*
*Ні плугам, ні пяром*
*Я заплаціць за хлеб,*
*За сваю прыстань,*
*Наймуся ў дайнім*



З сям'ёй на дачы на Нарачы

*Вільнюсе праваднікам*
*Па горадзе вадзіць*
*Гасцей-турыстаў.*

.................................................

*Тут кожны камень быў*
*Сагрэты маім сном,*
*Абветраны*
*Гадоў суровым лёсам,*
*І сёння, ўслухаўшыся,*
*Чую першы гром –*
*Юнацкіх сваіх песняў*
*Адгалосы.*

Нязменна клікала М. Танка да сябе і зямля маленства. Сказанае ў «Лістках календара» ў красавіку 1936 года, ён мог бы слова ў слова паўтарыць і тады, калі жыць заставалася ўжо зусім мала: «... нідзе я сябе так добра не адчуваў, як дома, са сваімі думамі, падобнымі да шумнага, гаманлівага кірмашнага натоўпу. Яны ніколі мяне і нідзе не пакідаюць. З імі нават у адзіночнай камеры на Лукішках я не быў самотны».

А вось самотна, балюча, тужліва было ў яго на сэрцы на схіле жыцця. Спачатку заўчасна страціў дачку, потым сястру. Не стала жонкі Любові Андрэеўны. Завяшчаў пахаваць сябе на радзіме, там, дзе знайшлі свой вечны спачын маці і бацька. Калі 7 жніўня 1995 года Яўгена Іванавіча не стала, ягоная апошняя воля была выканана. Народны паэт Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, ён, як і хацеў, назаўсёды застаўся са сваім родным Нарачанскім краем.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ, пісьменнік**